МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА»

Факультэт : педагагічны
Кафедра: педагогікі

Дапушчана да абароны
«31» января 2013 г.
Загадчык кафедры
__________ Н.А.Ракава

МАГІСТЭРСКАЯ ДЫСЕРТАЦЫЯ

**РАЗВІЦЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ШКОЛЫ БЕЛАРУСІ ВА ЎМОВАХ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ**

Спецыяльнасць: 1-08 8006 Агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Ліфанава Вольга Віктараўна

Навуковы кіраўнік:

Цяцерына Вера Уладзіміраўна

Кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Віцебск, 2013

**Рэферат**

Магістэрская дысертацыя 75 с., 7 табл., 106 крыніц, 6 дадаткаў.

**Ключавыя словы:** палітыка, настаўніцкія кадры, сістэма адукацыі, усенавуч, формы навучання, навучальныя ўстановы, "пралетарызацыя", беларусізацыя, ліквідацыя непісьменнасці.

**Аб'ект даследавання** - нацыянальная школа Беларусі ў перыяд беларусізацыі (1924–1929 гг.).

**Прадмет даследавання** – працэс развіцця нацыянальнай школы Беларусі ва ўмовах палітыкі беларусізацыі (1924–1929 гг.)

**Мэта даследавання** – вызначыць змяненні і адлюстраваць дынаміку развіцця школьнай адукацыі на тэрыторыі Беларусі пад уплывам адукацыйнай палітыкі перыяду беларусізацыі.

**Метады даследавання:** пры аналізе крыніц і інтэрпрэтацыі фактаў выкарыстоўваліся рэтраспектыўны, гісторыка-тыпалагічны, параўнальны, гісторыка-генетычны метады. Выкарыстанне праблемна-храналагічнага прынцыпу дазволіла вывучыць праблему ў развіцці, цеснай сувязі з сацыяльна-эканамічнымі і грамадска-палітычнымі працэсамі. У магістэрскай дысертацыі выкарыстаны логіка-гістарычны і параўнальны віды аналізу педагагічнай і гістарычнай літаратуры, а таксама архіўных і статыстычных дадзеных.

**Навізна атрыманых вынікаў:** у працы прадстаўлены аналіз удасканалення сістэмы народнай адукацыі ў перыяд беларусізацыі (1924 - 1929 гг.), увядзення ўсеагульнага абавязковага навучання, развіцця прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школы, фунуцыяніравання сістэмы падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў.

Вынікі, матэрыялы і высновы даследавання могуць стымуляваць тэарэтычную распрацоўку праблемы ўрадавай палітыкі ў галіне адукацыі. Яны могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы лекцый і спецкурсаў па гісторыі Беларусі і гісторыі народнай адукацыі.

**Змест**

Уводзіны ..................................................................................4

1 Паняцце беларусізацыі ў сферы нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі ..................................................................................8

1.1 Беларусізацыя як дзяржаўная палітыка ў 20-я гг. XX ст.: прычыны, характэрныя рысы, вынікі ..................................................................................8

1.2 Рэалізацыя палітыкі беларусізацыі сярод нацыянальных меншасцей..................................................................................23

2 Нацыянальная палітыка ў галіне народнай адукацыі Беларусі (1924 – 1929 гг.)..................................................................................35

2.1 Змены ў сістэме школьнага будаўніцтва пад уплывам працэсу беларусізацыі..................................................................................37

2.2 Падрыхтоўка педагагічных кадраў у кантэксце развіцця беларускай нацыянальнай школы ..................................................................................50

Заключэнне..................................................................................64

Спіс выкарыстаных крыніц ..................................................................................69

Дадаткі..................................................................................77

**Уводзіны**

Прыярытэтным пытаннем дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь застаецца пытанне аб развіцці нацыянальнай сістэмы адукацыі. Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь, арыентавана на ўваходжанне нашай краіны ў сусветную адукацыйную прастору, абапіраючыся на этнакультурную аснову і здабыткі нацыянальнай школы. На першы план выходзіць ідэя развіцця і ўмацавання самасвядомасці, самапавагі і нацыянальнай годнасці, якая і ўсведамляецца як адзін з вядучых прынцыпаў сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Адукацыя разглядаецца як неад'емны кампанент кансалідацыі і развіцця нацыі.

За апошніх 5 гадоў колькасць устаноў адукацыі значна зменшылася, стала менш навучэнцаў у беларускамоўных школах. Складанасці назіраюцца у вывучэнні асобных прадметаў. Вывучэнне вопыту развіцця нацыянальнай школы Беларусі ва ўмовах палітыкі беларусізацыі, дае магчымасць арганічнага ўключэння пазітыўнага вопыту 20-х гадоў XX ст. у работу сучаснай нацыянальнай школы.

Перыяд беларусізацыі (1924 – 1929 гг.) з'яўляецца адной з самых складаных старонак гісторыі Беларусі. Акрэслены час зрабіўся пераломным і лёсавызначальным для беларускага народа, у жыцці якога адбываліся кардынальныя змены палітычных і сацыяльных устояў. У складаных умовах ідэалагічных змяненняў народная адукацыя з'яўлялася адным з важнейшых інструментаў унутранай палітыкі дзяржавы. Школа як спецыфічны грамадскі інстытут заўсёды была наперадзе ў справе дзяржаўна-патрыятычнага выхавання, павышэння культурнага ўзроўню і фарміравання грамадзянскай пазіцыі насельніцтва. Міжнародная супольнасць уважліва сачыла за станаўленнем палітычнага ладу ў маладой савецкай дзяржаве. Таму курс на пераход да ўсеагульнага навучання і развіццё нацыянальнай адукацыі, з'яўляўся адным з найважнейшых тактычных крокаў, які падмацоўваў намаганні стварыць агульную карціну дэмакратызацыі грамадства.

Да сённяшняга часу ў гістарыяграфіі не існуе адзінага аб'ектыўнага і ўсебаковага даследавання перыяду беларусізацыі. Прычына дадзенай сітуацыі бачыцца ў складанасці тагачасных сацыяльна-эканамічных і палітыка-ідэалагічных

умоваў, якія да сённяшняга дня не атрымалі дастаткова поўнай і аб'ектыўнай ацэнкі з боку гісторыкаў. На сённяшні дзень наяўнасць арыгінальных першакрыніц перыяду беларусізацыі дазваляе ажыццявіць аб'ектыўнае даследаванне на якасна новым узроўні, згодна з патрабаваннямі сучаснай навукі. Багаты фактычны матэрыял дае магчымасць прасачыць, як рэальна ўплывалі палітычныя працэсы на школу і педагагічную думку, і наадварот, як адукацыйны фактар уздзейнічаў на дзяржаўную палітыку і жыццё грамадства. Таму крытычны аналіз і ўспрыняцце вопыту гістарычнага мінулага ў справе школьнай адукацыі з'яўляецца вельмі актуальнай патрэбай для пашырэння нацыянальнай свядомасці і грамадзянскай культуры нашага народа.

У перыяд беларусізацыі (1924 – 1929 гг.) быў накоплены багаты вопыт у галіне развіцця народнай адукацыі на Беларусі, дасягнуты значныя поспехі ў справе павышэння інтэлектуальнага ўзроўню працоўных. Развіццё нацыянальнай школы адлюстроўвае гістарычную пераемнасць паміж пакаленнямі, вызначае духоўныя ідэалы грамадства. У сучасных умовах развіцця грамадства важнае значэнне мае стварэнне навуковых прац, у якіх абагульняецца дзяржаўная палітыка ў галіне народнай адукацыі. Вывучэнне гэтай праблемы дае магчымасць падсумаваць накопленыя веды, ацаніць іх з пазіцыі сучаснай навукі, выдзеліць найбольш актуальныя накірункі ў арганізацыі вучэбна-выхаваўчай дзейнасці.

Навуковых прац па гісторыі развіцця нацыянальнай школы Беларусі перыяду беларусізацыі невялікая колькасць. Выключнае месца сярод іх займае даследванне Куракевіч Н.І. "Дзяржаўная палітыка ў галіне народнай адукацыі і падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў у Беларусі (1921 – 1930 гг.)". У працы прадстаўлены аналіз функцыянавання сістэмы падрэхтоўкі настаўніцкіх кадраў, іх ўдзел у грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі. Часткова закранаецца пытанне развіцця нацыянальнай школы Беларусі у працах А.А. Яноўскага, які вывучаў склад студэнцкай моладзі, Н.І. Латыша, А.Н. Баюры, Н.І. Піваваравай і іншых даследчыкаў. Баталка Т.І. разглядала стварэнне беларускай нацыянальнай школы ў дзяржаўна-палітычным кантэксце. Спробы сучаснай ацэнкі адукацыйнай палітыкі 20-х гадоў XX ст., змешчаны ў артыкуле Л.М. Лыча "Беларусізацыя 20-х гадоў".

Канстатуючы недастатковую тэарэтычную распрацаванасць разглядаемай праблематыкі і яе практычную запатрабаванасць, мы вызначылі тэмай даследвання: “Развіцце нацыянальнай школы Беларусі ва ўмовах палітыкі беларусізацыі”.

Мэта даследавання – вызначыць змяненні і адлюстраваць дынаміку развіцця школьнай адукацыі на тэрыторыі Беларусі пад уплывам адукацыйнай палітыкі перыяду беларусізацыі.

Дасягненне пастаўленай мэты патрабавала вырашэння наступных задач:

1. Вызначыць і прааналізаваць прычыны, характэрныя рысы, шляхі рэалізацыі і вынікі ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі;
2. Выявіць і ахарактарызаваць асаблівасці рэалізацыі палітыкі беларусізацыі сярод нацыянальных меньшасцей;
3. Ахарактарызавать змены ў сістэме школьнага будаўніцтва пад уплывам працэсу беларусізацыі;
4. Даследваць дзейнасць педагагічных навучальных установ па падрыхтоўцы настаўніцкіх кадраў.

Аб’ектам даследавання з’яўляецца нацыянальная школа Беларусі ў перыяд беларусізацыі (1924–1929 гг.).

Прадмет даследавання – працэс развіцця нацыянальнай школы Беларусі ва ўмовах палітыкі беларусізацыі (1924–1929 гг.)

У якасці геаграфічных рамак даследавання прынята тэрыторыя сучаснай Рэспублікі Беларусь.

Метадалагічную аснову дысертацыі складае гістарызм, які разумеецца як прынцып разгляду грамадска-палітычных рэалій у дынаміцы іх развіцця, шматг раннасці, функцыянальнасці. У даследаванні пераасэнсавана праблема развіцця беларускай нацыянай школы ў 20-я гг. XX ст. праз адзінства крыніцазнаўчага, эмпірычнага і агульнатэарэтычнага падыходаў. Пры аналізе крыніц і інтэрпрэтацыі фактаў выкарыстоўваліся рэтраспектыўны, гісторыка-тыпалагічны, параўнальны, гісторыка-генетычны метады. Выкарыстанне праблемна-храналагічнага прынцыпу дазволіла вывучыць праблему ў развіцці, цеснай сувязі з сацыяльна-эканамічнымі і грамадска-палітычнымі працэсамі.

У магістэрскай дысертацыі выкарыстаны логіка-гістарычны і параўнальны віды аналізу педагагічнай і гістарычнай літаратуры, а таксама архіўных і статыстычных дадзеных.

Выкладанне атрыманых вынікаў здзяйснялася метадамі апісання, тлумачэння і супастаўлення выкарыстаных матэрыялаў. Прымяненне сістэмнага падыходу дазволіла рабіць абгрунтаванні і вывады на аснове разнастайнага фактычнага матэрыялу.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Аб фабрычна-заводскай 7-годцы: асноўныя прынцыпы арганізацыі фабрычна-заводскай сямігодкі // Асвета. - 1928. - №7. - С. 10-11.
2. Адукацыя і нацыянальна-культурнае адраджэнне: Тэз. навук. дакл. на Міжнар. канф. (25–26 кастр.1994 г., г. Мінск): У 2 ч. / Нац. ін-т адукацыі Рэспублікі Беларусь, Нац. ін-т гуманітар.навук Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 1994. – Ч. 1. – 120 с.
3. Аляксандраў, Г. Праграма вывучэння мястэчка / Г. Аляксандраў // Наш край. - 1928. - №2 (29). С. 45 – 53.
4. Андрэева, Е. Аркадзь Смоліч і яго ўклад у нацыянальную педагогіку / Е.Г. Андрэева // Народная асвета. – 1996. – № 9. – С. 135 – 142.
5. Арлова, Г.П. Адраджэнне народнай педагогікі – прыярытэт выхаваўчай работы сучаснай школы / Г.П. Арлова // Народная Асвета. – 2012. - № 12. – С. 3-6.
6. Асноўныя прынцыпы арганіацыі працоўнай 7-гадовай школы. - Мінск: Дзярж. Выд. Беларусі, 1926. - 7 с.
7. Астрога, В.А. Вывучэнне гісторыі польскай меншасці ў міжваеннай Беларусі / В.А.Астрога // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001г.) / У.І.Навіцкі, М.С.Сташкевіч. – Мінск: Дэполіс, 2001. – С. 232–236.
8. Балицкий, А. Итоги и план работы Наркомпроса Белоруссии / А. Балицкий // Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. - 1927. - Вып. 9-10. - С. 3-8.
9. Бандарчык, В. Атлас “Народы Беларусі” як адна з крыніц вывучэння нацыянальных меншасцей Рэспублікі / В.Бандарчык // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн.1 / Нав. рэд. С.А.Яцкевіч. – Брэст–Мінск–Віцебск, 1996. – С. 67–71.

10. Бараноўскі Я. І. За дружбу народаў: Дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі па ажыццяўленню ленінскай нацыянальнай палітыкі ў1921-1925 гг.— Мінск: Беларусь, 1972.— С.90.

11. Баталка, Т.І. Нацыянальная палітыка ў галіне народнай асветы Беларусі ў 20-я гг. / Т. І. Баталка // Веснік БДУ. Серыя 3. 1991- № 2 .- С. 13-17.

12. Беларусь: Народ. Государство. Время / редкол.: А.А. Коваленя [и др.]: – Мінск: Беларуская навука, 2009. - 879 с.

13. Белорусская Советская Социалистическая Республика. - Минск: СНК, 1927. - 528 с.

14. Белорусская Социалистическая Республика в 1922-23 г.: К 5-му съезду Советов Белоруссии: отчет / под ред. Секретариата ЦИК и СНКБ. - Минск, 1924. - 20 с.

15. Белорусская ССР в цифрах: к 10-летию существования БССР. 1919-1929 / Центр, стат. упр. - Минск, 1929. - 534 с.

16. Всесоюзная перепись населения 1926 г. Т. X. БССР. Отдел I: Народность, родной язык, возраст, грамотность. М., 1928. С. 66—69.

17. Гісторыя БССР: у 5 т. Перамога Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцьп і пабудова сацыялізму у БССР. (1917-1937 гг.) / рэдкал. І. М. Ігнаценюк (гал.рэд) [і інш.]: Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – 3 т. - 693 с.

18. Гісторыя Беларуси: вучэб. дапам, для ВНУ: у 2 ч. / пад. рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. - Ч. 2. - Мінск: Універсітэцкае, 1998. - 463 с.

19. Глагоўская, Л. Нацыянальнае пытанне ў Беларусі пасля 1-ай сусветнай вайны / Л.Глагоўская // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 2 / Нав. рэд. С.А.Яцкевіч. – Брэст–Мінск–Віцебск, 1996. – С. 42–43.

20. Даніловіч, В.В. Моладзь у грамадска-палітычным жыцці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь напярэдадні беларусізацыі / В.В. Даніловіч // Весці Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2009. - № 3. – С. 52 – 60.

21. Два гады нацыянальнай работы ў БССР: Збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальным пытанні.— Мн.: Выд-не Нац. кам. ЦВК БССР, 1929, 47 с.

22. Дзейнасць Урада БССР за 1926/27 г. - Мінск: Выд. кіраўніцтва спраў СНК і Экран, нарады БССР, 1928. - 339 с.

23. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. - Фонд 10051. - Воп. 1. - Спр. 64.

24. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. - Фонд 10051. - Воп. 1. - Спр. 89.

25. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. - Фонд 10062. - Воп. 1. - Спр. 333.

26. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 10062. - Воп. 1. - Спр. 523.

27. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. - Фонд 10062. - Воп. 1. - Спр. 99.

28. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. - Фонд 118. - Воп. 1. - Спр. 3.

29. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. - Фонд 118. - Воп. 1. - Спр. 524.

30. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. - Фонд 118. - Воп. 1. - Спр. 526.

31. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. - Фонд 476. - Воп. 1. - Спр. 24.

32. Думін, С.У. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць / С.У.Думін, І.Б.Канапацкі. – Мінск: Полымя, 1993. – 202 с.

33. Дрозд, Л.Н. Развитие средней общеобразовательной школы в Белоруссии, 1917 – 1941 гг. / Л.Н. Дрозд. – Мн.: Нар.Асвета, 1986. – 160 с.

34. Елизаров, С.А. Национальные советы в структуре административно-территориального устройства БССР в 1920–30-е гг. / С.А.Елизаров // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф. (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.) / У.І.Навіцкі, М.С.Сташкевіч. – Мінск: Дэполіс, 2001. – С. 252–256.

35. Жыгал, І.У. Некаторыя дасягненні савецкай улады ў сферы нацыянальна-культурнага будаўніцтва сярод літоўскага насельніцтва БССР у 20-я гг. ХХ ст. у кантэксце палітыкі беларусізацыі / І.У. Жыгал // Сборник материалов Международной научно-практической конференции молодых ученых «Научные стремления - 2011» (14-18 ноября 2011 года). Том 2 / Совет молодых ученых Национальной академии наук Беларуси. – Минск: Белорусская наука, 2011. – 1158 с.

36. Зайко, К.І. На крутым павароце гісторыі /К.І. Зайко // Памяць: Гіст.-дакум. Хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 1-я / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. Рэд.). – Мінск: БелЭн, 2002.- С. 250 – 271.

37. Ильюшин, Н.М. Народное образование в Белорусской ССР / Н.М. Ильюшин. - Мн.: Государственное учебно-педагогическое издательство Министерства просвещения БССР, 1961. – 437 с.

38. Иоффе, Э.Г. Страницы истории евреев Белоруссии / Э.Г. Иоффе. - Мн., 1996. – 95 с.

39. Каляда, І. У. Палітыка беларусізацыі і прычыны яе згортвання / І.У.Каляда // Весці НАНБ: серыя гуманітарных навук. – 1998. – № 1. – С.75–80.

40. Касцюк, М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. Касцюк. – Мн., 2000. – 342 с.

41. Клімаў, І. Беларусізацыя ў дакументах / І. Клімаў // Беларускі Гістарычны Агляд. – 2001. – Том 8. – Сшыткі 1 – 2 (14 – 15). – С. 273 – 295.

42. Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах. 1918-1988.— Минск: Беларуст, 1988.— 253 с.

43. Коршук, У. К. Беларусізацыя. 1920-я гады: Дакументы і матэрыялы / У.К Коршук, Р.П. Платонаў, І.Ф.Раманоўскі, Я.С. Фалей. - Мінск, 2001. С. 129–135.

44. Крыніцкі, А. Чарговыя пытанні нацыянальнай палітыкі КП(б)Б / А. Крыніцкі. – Мн.: Выд. ЦК КП(б)Б, 1926. – 24 с.

45. Культурное строительство БССР. - Минск: издание УМХУ БССР, 1940. - 109 с.

46. Куракевіч, Н.А. Нацыянальная палітыка ў галіне народнай асветы: асаблівасці развіцця агульнаадукацыйнай школы на Беларусі ў 20- я гады XX стагоддзя / Н.А Куракевіч // Народная асвета.- 2010.- № 6. – С. 3-8.

47. Куракевіч, Н.А. Нацыянальная палітыка ў галіне народнай асветы: асаблівасці развіцця агульнаадукацыйнай школы на Беларусі ў 20- я гады XX стагоддзя / Н.А. Куракевіч // Народная асвета.- 2010.- № 7. – С. 3-6.

48. Куракевіч, Н.А. Падрыхтоўка педагагічных кадраў у навучальных установах у Беларусі ў 1920-я гады / Н.А. Куракевіч // Беларускі гістарычны часопіс.- 2011. - № 5. – С. 33-39.

49. Куракевіч, Н.А. Развіцце сярэдняй школы і прафадукацыі ў Беларусі ў аднаўленчы перыяд / Н.А. Куракевіч // Народная асвета.- 2001.- № 11. – С. 64-69.

50. Куракевіч, Н.І. Дзяржаўная палітыка ў галіне народнай адукацыі і падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў у Беларусі (1921 – 1930 гг.): аўтарэф. дic. …канд. гіст. навук: 07.00.01 / Н.І. Куракевіч. - Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2002. – 23 с.

51. Литвиненок, Р.С. Польское общественно-политическое движение в Беларуси и Литве (конец XIX - начало XX вв.) / Р.С. Литвиненок // Вестник БГУ.— Серия 3, 1998.— №2.— С. 10-16.

52. Лыч, Л.М. Беларусізацыя як дамінанта нацыянальнай палітыкі (ліпень 1924 – сярэдзіна 30-х гадоў) / Л.М. Лыч // Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў XX стагоддзі. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 1997. – С. 22–37.

53. Мяснікоў, А. Беларусізацыя як дзяржаўная палітыка ў 20-я гады XX стагоддзя / А. Мяснікоў // Беларускі Гістарычны Зборнік. – Białoruskie Zeszyty Historyczne [Электронны рэсурс]. – 2001. – № 16.– Рэжым доступу: http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/bzh/16/16kom_miasnikou.htm. – Дата доступу: 17.11.2012.

54. Навіцкі, У.І. Савецкая палітыка ў адносінах да этнічных супольнасцей Беларусі / У.І. Навіцкі // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Навук. канф. (Мінск, 6-7 снеж. 2001 г.) / Навук. рэд.: У. Навіцкі, М. Сташкевіч. – Мн.: Дэполіс, 2001. – 387 с.

55. Народное образованне в БССР: Сб. документов н материалов. Т. 1. 1917 -1928гг. / Гл. арх. упр. При совете Министров БССР; редкол.: Р. С. Васильева (отв.ред.) [и др.]. - Минск: Нар. Асвета, 1979. – 460 с.

56. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / рэдкал.: А.П. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]: -Мінск: Беларусь, 1995. 2 ч.

57. Нацыянальны архіў Рэслублікі Беларусь. - Фонд 101. - Воп. 1. - Спр. 3107.
58. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 101. - Воп. 1. - Спр. 1331.
59. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 101. - Воп. 1. - Спр. 3494.
60. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 101. - Воп. 1. - Спр. 3603.
61. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 101. - Воп. 1. - Спр. 2190.
62. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 205. - Воп. 1. - Спр. 1.
63. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 205. - Воп. 1. - Спр. 1007.
64. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 205. - Воп. 1. - Спр. 1041.
65. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 205. - Воп. 1. - Спр. 1044.
66. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 205. - Воп. 1. - Спр. 1073.
67. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 205. - Воп. 1. - Спр. 1075.
68. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 205. - Воп. 1. - Спр. 17.
69. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 205. - Воп. 1. - Спр. 57.
70. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 218. - Воп. 1. - Спр. 17.
71. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 218. - Воп. 1. - Спр. 81.
72. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 265. - Воп. 1. - Спр. 1393.
73. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 31. - Воп. 1. - Спр. 306.
74. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 4. - Воп. 8. - Спр. 11.
75. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 42. - Воп. 1. - Спр. 1183.

76. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 42. - Воп. 1. - Спр. 1214.

77. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 42. - Воп. 1. - Спр. 125.

78. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 42. - Воп. 1. - Спр. 164.

79. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 42. - Воп. 1. - Спр. 211.

80. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 42. - Воп. 1. - Спр. 164.

81. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 6. - Воп. 1. - Спр. 1843.

82. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 701. - Воп. 1. - Спр. 10.

83. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 101. - Воп. 1. - Спр. 1183.

84. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 101. - Воп. 1. - Спр. 2175.

85. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 42. - Воп. 1. - Спр. 603.

86. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 42. - Воп. 1. - Спр. 675.

87. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 42. - Воп. 1. - Спр. 840.

88. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. - Фонд 42. - Воп. 1. - Спр. 1679.

89. Новик, Е. К. Формированне кадров народного образовання Белоруссии (1917-1941гг.) / Е.К. Новик. - Мн.: Наука и техника, 1981. – 295 с.

90. Новыя праграмы для II канцэнтру сямёхгадовай працоўнай школы // Асьвета. 1927. № 5–6. С. 30.

91. Платонаў, Р. Лесы. Гісторыка-дакументальныя нарысы аб людзях і малавядомых падзеях духоўнага жыцця Беларусі 20-х – 30-х гг. / Р. Платонаў. – Мн., 1998. – 316 с.

92. Постановления 5 Всебелорусского съезда Советов. - Минск, 1924. - 30 с.

93. Праграма школ сялянскай моладзі // Асвета. - 1928. - №5. - С. 124-125.

94. Практическое разрешение национального вопроса в БССР. Ч.2: Работа среди национальных меньшинств в БССР.- Минск: Изд. Нацкам. ЦВК БССР, 1928. - С. 66-69.

95. Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы. Ч. 1, Мінск, 1928. – 11 с.

96. Пушкін, І. А. Удзел нацыянальных меншасцей у дзейнасці грамадска-палітычных аб'яднанняў БССР (20-я гг. XX ст.) / І.А. Пушкін // Магілёўская даўніна.— Магілёў, 1998. - С. 32-38.

97. Пушкин, І.А. Грамадска-палітычная актыўнасць палякаў БССР у 20-я гады і адносіны да іх з боку дзяржаўнага кіраўніцтва / І.А. Пушкін // Край: дыялог на сумежжы культур. - Магілеў: Абласная друкарня, 2000.- С. 47-64.

98. Снапоўская, С.В. Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX - пачатку XX стагоддзя / С.В. Снапоўская. - Мн.: Нар. Асвета,1995. – 128 с.

99. Сцепуро, Д. Всеобщее обучение в БССР / Д. Сцепуро. – М.: Госиздат, 1981. - 24 с.

100. Сянкевіч, Г. Р. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1941) / Г.Р. Сянкевіч. - Мінск, 1993. – 101 с.

101. Сянкевіч, Г.Р. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917—1945) / Г.Р. Сянкевіч. - Мінск, 1993. – 125 с.

102. Третьяк, И.Д. Листая страницы истории / И.Д. Третьяк // Полацкі веснік. – 2009. – 16 чэрв. – С. 5.

103. Тугай, У. В. Латышскі этнас у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі / У. В. Тугай. - Мінск: БДПУ, 2003. – 217 с.

104. Хоміч, С.М. Савецкая нацыянальная палітыка ў Беларусі ў 1920-30-я гады / С.М. Хоміч // Весці Нац. АН Беларусі.Сер.гуманітар.навук. – 2002. - № 4. – С. 46 – 51.

105. Шаўчук, І Фарміраванне цэнтраў вышэйшай гуманітарнай адукацыі ў БССР // Гісторыя: праблемы выкладання.- 2008. - № 10.- С. 3–7.

106. Янушевич, И.И. Конфессиональная ситуация в Беларуси в 1917–1941 гг. / И.И.Янушевич // Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя: матэрыялы Міжнар.навук.-тэарэт.канф., Мінск, 18–19 крас. 2003 г. – Мінск: БДПУ, 2004. – С. 188–190.